Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа №6 г.Смаргоні»

«Выкарыстанне актыўных і інтэрактыўных форм узаемадзеяння як сродак фарміравання грамадзянска-патрыятычнага і духоўна-маральнага развіцця навучэнцаў»

Мінкевіч Таццяна Аляксандраўна
настаўнік беларускай мовы і
літаратуры

Смаргонь, 2023

Сучасная школа заклікана вырашаць жыццёва важныя задачы рэалізацыі каштоўнасных асноў адукацыі, адной з якіх з'яўляецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне. Пастаўленая на сучасным этапе перад школай задача грамадзянска-патрыятычнага выхавання прадугледжвае не толькі фарміраванне поглядаў і перакананняў, але і ператварэнне тэарэтычных ведаў у канкрэтныя справы. У сувязі з гэтым апошнім часам актывізаваўся пошук новых метадаў і форм арганізацыі працэсу бесперапыннага выхавання. Бесперапыннае выхаванне навучэнцаў вызначае асноўныя ўмовы эфектыўнасці грамадзянска-патрыятычнай работы ва ўстанове адукацыі: прафесіяналізм, высокі ўзровень ідэйнай перакананасці педагогаў. Для яе эфектыўнага вырашэння ад школы патрабуецца стварэнне цэласнай сістэмы па фарміраванні грамадзянска-патрыятычных арыенціраў у вучняў. Перад установай адукацыі стаяць наступныя мэты і задачы.

Мэта: прывіваць навучэнцам любоў да Радзімы, далучаць іх да сацыяльных каштоўнасцей - патрыятызму, грамадзянскасці, гістарычнай памяці, абавязку; фармаваць асновы нацыянальнай самасвядомасці.

Для дасягнення мэты па грамадзянска-патрыятычным выхаванні школа вырашае наступныя асноўныя задачы:

вывучэнне гісторыі свайго краю;

выхаванне пачуцця любові, гонару за сваю Радзіму, гатоўнасці яе абараняць;

развіццё ў падлеткаў павагі, міласэрнасці і спагады да ветэранаў вайны і працы, сем'яў загінуўшых абаронцаў Айчыны, састарэлым людзям;

стварэнне неабходных умоў для выхавання патрыятызму, як духоўнага складальніка асобы грамадзяніна.

Правільнае вызначэнне мэты і задач грамадзянска-патрыятычнай работы дапамагае выбраць аптымальныя метады і формы арганізацыі выхаваўчых мерапрыемстваў, дзе акрамя конкурсаў, акцый, урокаў мужнасці, праглядаў відэафільмаў і кінафільмаў, экскурсій можна выкарыстаць інтэрактыўныя формы ўзаемадзеяння.

Сучасны свет патрабуе новых выхаваўчых падыходаў, якія здольны развіваць пачуццё грамадзянскага абавязку, любові да Радзімы, павагі да гістарычнага мінулага. Патрыятычнае выхаванне пачынаецца са спазнання каштоўнасці Радзімы. У працэсе развіцця чалавек паступова ўсведамляе сваю прыналежнасць да калектыву, класа, школы, народа, Радзімы.

Вяршыняй патрыятычнага выхавання з'яўляецца ўсведамленне сябе грамадзянінам краіны. Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне павінна арыентавацца не толькі на любоў да Радзімы, але і веру ў сябе, ва ўласныя сілы, у вялікія здзяйсненні нашых бацькоў і дзядоў. Гэта любоў да кожнага

кутка і кожнага грамадзяніна нашай шматнацыянальнай Беларусі. Выхоўваць моладзь трэба на перамогах, а не паражэннях, на стварэнні, а не на разбурэнні. Такім чынам, выхаванне грамадзяніна і патрыёта знаходзіцца ў цэнтры фарміравання выхаваўчай прасторы навучальнай установы.

Выхаваўчая работа па грамадзянска-патрыятычным напрамку будзе лічыцца эфектыўнай, калі навучэнцы авалодаюць ведамі гісторыі Беларусі, сучасна-эканамічнага, сацыяльна-палітычнага культурнага жыцця грамадства. Калі ў іх будзе развіта пачуццё гонару за сваю краіну – Рэспубліку Беларусь, а ідэйна-палітычная свядомасць, інфармацыйная і прававая культура будуць на высокім узроўні. Дзеці ў поўнай меры павінны авалодаць ведамі канстытуцыі, сімволікі Рэспублікі Беларусь, імкнуцца адстойваць свае ідэалы, сфарміраваць актыўную жыццёвую пазіцыю, удзельнічаць у жыцці класа, школы, дзейнасці ГА "БРСМ" і БРПА.

Чалавек, пазбаўлены патрыятычных пачуццяў, з'яўляецца чужынцам у сваёй Айчыне. Актыўна-дзейсная форма праявы патрыятызму - гэта канкрэтная дзейнасць на карысць Айчыны, служэнне інтарэсам народа. Патрыятычная дзейнасць разнастайная ў сваіх праявах: абарона Айчыны; уменне ставіць інтарэсы Айчыны вышэй за прыватныя інтарэсы; гатоўнасць прыйсці краіне на дапамогу; добрасумленная праца; служэнне Радзіме. Патрыятызм сёння выступае ў якасці духоўнай асновы па адраджэнні Беларусі.

У буры эканамічных пераўтварэнняў, якія адбываюцца ў нашай краіне, грамадства ўсё часцей сутыкаецца з цынічнымі злачынствамі чалавека супраць прыроды, супраць сваёй гісторыі, свабоды, супраць самога сябе. З экранаў тэлевізара літаральна лавінай нясецца на нас негатыўнае адлюстраванне крымінальнага свету, бесклапотнага гламурнага жыцця. Аўтары фільмаў і тэлевізійных праграм не саромеюцца ў выбары выразаў. Мы ўжо самі не заўважаем таго, што ў размове сустракаецца слэнг, а замест класікі, цікавімся лёгкім чытаннем, асноўнай часткай якога з'яўляюцца аднатыпныя дэтэктывы. Мы зачыніліся ў свой свет і практычна не маем зносіны сябар з сябрамі. Мы, аддаючы даніну модзе або шукаючы абароны ад руціны жыцця, ідзем у царкву да Бога і просім аб дапамозе, але пры гэтым спакойна  праходзім міма жабракоў, а значыць міма чалавечай бяды. Вечна спяшаемся, не глядзім у вочы адзін аднаму і не маем патрэбу ў зносінах. Мабыць, гэта і ёсць нашае сучаснае грамадства. Грамадства дарослых, якое адказвае за сябе само.

Ва ўсе стагоддзі людзі высока шанавалі духоўна-маральную выхаванасць. Глыбокія сацыяльна - эканамічныя пераўтварэнні, якія адбываюцца ў сучасным грамадстве, прымушаюць нас разважаць аб будучыні нашай

краіны, аб яе моладзі. У наш час часткова страчаны маральныя арыенціры, падрастаючае пакаленне можна вінаваціць у бездухоўнасці, бязвер'і, агрэсіўнасці. Духоўна-маральнае развіццё і выхаванне асобы, вядома, пачынаецца ў сям'і. Бацькі ўплываюць на развіццё дзіцяці, арганізаваўшы засваенне маральных норм, якія рэгулююць паводзіны чалавека ў грамадстве. Гэтыя нормы ў выглядзе эталонаў засвойваецца дзіцем. Ад таго, якія эталоны закладуць бацькі ў душу дзіцяці, шмат у чым залежыць яго далейшы лёс. З гэтай нагоды вельмі дакладна казаў святар Валянцін Маркаў, «...дзіця вырасла не само па сабе, яно як галінка на дрэве, якое каранямі сыходзіць у глыбіню мінулага. Сям'я - гэта цэласны арганізм. І праблемы маладога парастка – гэта, у першую чаргу, праблемы глебы, на якой ён расце». На духоўна-маральнае развіццё аказвае ўплыў і сацыякультурнае асяроддзе, якое акружае навучэнцаў. Наступным найважнейшым кампанентам у працэсе духоўна-маральнага развіцця з'яўляецца самавыхаванне.

У адной з індзейскіх прытч гаворыцца, што калісьці даўно стары індзеец адкрыў свайму ўнуку адну ісціну. У кожным чалавеку ідзе змаганне, вельмі падобнае на змаганне двух ваўкоў. Адзін воўк увасабляе зло – зайздрасць, рэўнасць, шкадаванне, эгаізм, амбіцыі, хлусню, а другі воўк – дабро – мір, каханне, надзею, ісціну, дабрыню, вернасць... Маленькі індзеец, крануты да глыбіні душы словамі дзеда, на некалькі імгненняў задумаўся, а потым спытаў: «А які воўк у канцы перамагае?»

Стары індзеец ледзь прыкметна ўсміхнуўся і адказаў: “Заўсёды перамагае той воўк, якога ты корміш…”

Найважнейшая роля ў духоўна-маральным развіцці і выхаванні асобы адводзіцца школе. Задача настаўнікаў заключаецца не толькі ў тым, каб узброіць вучняў глыбокімі і трывалымі ведамі, але і сфарміраваць у школьнікаў духоўна-маральныя якасці.  Канцэпцыяй духоўна-маральнага выхавання і развіцця грамадзяніна вызначана, што духоўна-маральнае выхаванне ў сучасным адукацыйным працэсе павінна ажыццяўляцца ў ходзе правядзення ўсіх урокаў і пазаўрочных заняткаў. Бо кожны прадмет валодае ўнікальным, незаменным каштоўнасна-сэнсавым патэнцыялам, які можа быць актуалізаваны і плённа задзейнічаны. Школа – адзіны сацыяльны інстытут, праз які праходзяць усе грамадзяне краіны. Таму менавіта ў школе павінна быць засяроджана не толькі інтэлектуальнае, але і духоўнае, культурнае жыццё школьніка. Дзіця школьнага ўзросту, асабліва ў пачатковай школе, найбольш успрымальна да духоўна-маральнага развіцця і выхавання. А вось недахопы гэтага развіцця і выхавання цяжка папоўніць у наступныя гады. Перажытае і засвоенае ў дзяцінстве адрозніваецца вялікай псіхалагічнай устойлівасцю. Чалавек не выхоўваецца па частках, таму вельмі

важная інтэграцыя ўсіх вышэйпералічаных складальнікаў, якія ўяўляюць сабой сістэмны падыход духоўна-маральнага выхавання.

Пранікнуць ва ўнутраны свет дзіцяці, зразумець яго і прыйсці да паразумення няпроста. Нялёгка бацькам, яшчэ складаней педагогам. Для вырашэння гэтай складанай задачы дарослы спрабуе працягнуць тонкую духоўную нітку, якая б звязала яго з дзіцём. Галоўнае паспрабаваць захаваць гэтую сувязь, не даць ёй абарвацца! Яшчэ я думаю, што зносіны дзіцяці з выдатным: прыродай, музыкай, літаратурай, жывапісам, тэатрам – з'яўляецца магутнай крыніцай духоўна-маральнага выхавання.

Дзеці па прыродзе сваёй адкрытыя і добрыя. Назіранне за прыродай, слуханне музыкі, чытанне мастацкіх твораў радуюць дзіця, вучаць яго суперажываць, узбагачаюць яго эмацыянальны вопыт. Вельмі важна навучыць дзяцей адчуваць сябе задаволенымі і шчаслівымі ў любым становішчы, цешыцца жыццю, дзівіцца яго цуду. Педагог – гэта той чалавек, які павінен перадаць новаму пакаленню ўсе каштоўныя назапашванні стагоддзяў і не перадаць забабонаў, заган і хвароб. Адсутнасць духоўнага развіцця, як мы зараз бачым, прывяла да маральнага спусташэння. Зніклі словы: дабро – як крыніца радасці, мір і згода ў душы, пакаянне – адрачэнне ад зла; міласэрнасць як літасць у сэрцы; мілата, якая выклікана добрымі справамі і любоўю да блізкіх, і такіх слоў можна пералічваць мноства. Людзі ўсё больш сталі нецярпімыя адзін да аднаго. Знікла духоўнасць. Не стала даверу адно да аднаго.

Добры чалавек з добрага сэрца свайго выносіць добрае, а злы чалавек з злога сэрца свайго выносіць злое. Духоўна-маральнае выхаванне ў цяперашні час найчасцей разумеецца як маральнае выхаванне ў адпаведнасці з духоўнымі традыцыямі народа. Школа спрабуе праз культуру свайго народа ажыццяўляць уплыў на духоўна-маральнае выхаванне школьнікаў. На сённяшні дзень духоўна-маральнае выхаванне не можа быць прадстаўлена асобнымі ўрокамі ў навучальным працэсе. Гэта, хутчэй за ўсё, навучанне і выхаванне на аснове духоўнасці. Ва ўсе часы ядром культуры былі праваслаўныя асновы і традыцыі народнага жыцця. Духоўна-маральнае выхаванне нельга вырашыць толькі ў рамках школьнай адукацыі. Навучыць бацькоў і вучняў толькі быць духоўнымі нельга. Духоўна-маральнае выхаванне праблема комплексная і вырашыць яе можна паступова, уключаючы ў гэты працэс усіх удзельнікаў соцыума, як дарослых, так і дзяцей. Фундаментальнымі паняццямі духоўна-маральнага выхавання з'яўляюцца:

Зямля – агульны дом чалавецтва, зямля людзей і жывой прыроды. Айчына-адзіная, унікальная для чалавека Радзіма, дадзеная яму лёсам, якая

дасталася ад яго продкаў; Сям'я – пачатковая структурная адзінка грамадства, першая чалавечая агульнасць дзіцяці і натуральнае асяроддзе яго развіцця, дзе закладваюцца асновы будучай асобы. Праца – аснова чалавечага быцця, від дзейнасці які вылучае чалавека з жывёльнага свету, адэкватны сутнасці чалавека. Веды – вынік разнастайнай і творчай працы, магутны сродак развіцця асобы; мір – спакой і згода паміж людзьмі і дзяржавамі, галоўная ўмова існавання Зямлі і чалавецтва; чалавек – вышэйшая, абсалютная каштоўнасць, "мера ўсіх рэчаў", мэта, аб'ект, суб'ект і вынік выхаваўчай сістэмы школы.

Інтэрактыўныя метады работы дапамагаюць у выхаванні моладзі, іх можна выкарыстоўваць як для стварэння спрыяльнай атмасферы, арганізацыі камунікацыі, так для абмену думкамі, вырашэння пэўнага дыскусійнага пытання. Існуюць метады сэнсатворчасці, рэфлексіўнай дзейнасці. Інтэрактыўныя метады выхавання – гэта сістэма правіл арганізацыі прадуктыўнага ўзаемадзеяння вучняў паміж сабой і настаўнікам у форме дзелавых, ролевых гульняў, дыскусій, пры якіх адбываецца засваенне новага вопыту і атрыманне новых ведаў.

Інтэрактыўныя метады, якія ствараюць спрыяльную атмасферу, арганізацыю камунікацыі.

- Метад "Імя і рыса характару"
- Метад "Кампліменты"
- Метад "Прагноз надвор'я"
- Метад "Завяршы фразу" (Я прыйшоў сюды, каб…, Каб я быў чараўнікам, то…)
- Метад "Падары кветку".

Інтэрактыўныя формы ўзаемадзеяння.

Метад "Алфавіт", які дапамагае працаваць з тэрмінамі, маральнымі паняццямі. Патрэбна раскрыць сэнс вывучанага або аналізуемага паняцця праз падбор назоўнікаў, прыметнікаў або дзеясловаў.

Напрыклад, Р –радасць

А –актыўнасць

Д –дом

З –зямля

І –ідэя

М –маці

А –аблачынка

Метад "Работа з паняццямі"

Вызначыць паняцце(справядлівасць, шчасце, дабрыня, патрыятызм). Вучні працуюць са слоўнікамі, даведнікамі, з вучнямі можна правесці

гутарку-апытанне. Адказы вучняў фіксуюцца на лісце паперы. Затым выводзіцца найбольш поўнае, універсальнае паняцце.

Падбор падобных паняццяў (сінонімаў), дзякуючы якому пашыраецца ўяўленне пра паняцце. Тут таксама можна задаваць пытанні.

Падбор супрацьлеглых паняццяў (антонімаў) дапамагае параўнаць паняцці паміж сабой, выявіць найбольш істотныя характарыстыкі паняццяў.

Вызначэнне перавагі якасці (паняцця). Чым яно каштоўнае? Што пэўная якасць дае чалавеку? Ці мае чалавек перавагу, калі валодае такой якасцю?

Недахопы паняцця. Ці заўсёды пэўная якасць – гэта добрая справа? Вось калі чалавек справядлівы і вельмі трывала прытрымліваецца гэтай якасці. Ці заўсёды гэта добра?

Рэфлексія прадугледжвае расказаць пра свой маральны стан пры ўдзеле ў мерапрыемстве, ацаніць свае веды пра паняцце.

Метад “Інтэлектуальныя арэлі”

Гэта дыскусія па прапанаванай тэме, актуальным пытанні. Напрыклад, ці патрэбна служба ў арміі? Настаўнік прапануе выказацца па дадзенай праблеме вучню, затым эстафета пераходзіць да наступнага навучэнца, нарэшце трэба звярнуць увагу, каму найбольш удалося раскачаць арэлі. Па тэме дыскусіі можна прапаноўваць шэраг пытанняў.

Метад “Мінута гаварэння”

Гэты метад мае на ўвазе развіццё індывідуальнага мыслення, творчага ўяўлення, асэнсавання. Вучням прапаноўваецца паняцце і прапаноўваецца без падрыхтоўкі на працягу адной хвіліны аб гэтым паняцці прагаварыць звязаны тэкст. Другому вучню прапаноўваецца новае паняцце. Цікавай з’яўляецца тэма выбару прафесіі. Хто можа паўплываць на выбар прафесіі? Якія дапускаюцца памылкі пры выбары будучай прафесіі? Асабліва добра рабіць выбар разам з сябрам? Парады пры выбары прафесіі?

Цікавым з’яўляецца метад “Чатыры куты”. Вучням задаецца пытанне з чатырма варыянтамі адказу. Напрыклад, пры разглядзе тэмы “Сяброўства”, у чалавека павінна быць шмат сяброў; павінен быць адзін верны сябар; навошта яму сябры, калі ёсць бацькі, браты і сёстры; найлепш мець двух-трох сяброў. Вучні робяць свій выбар, займаюць свой кут і прыводзяць аргументы. Калі выбар зрабіць чамусьці цяжка, можна заняць месца ў цэнтры. Вучні могуць пераходзіць у іншы кут, калі іх меркаванні памяняліся.

Метады абмену дзейнасцю.

Метад “Акварыум”

Тут важна рассадка вучняў, бо ў час працы будуць непасрэдныя ўдзельнікі дыскусіі, па баках – назіральнікі, якія могуць заняць месца ў “акварыуме”, а таксама экспертныя групы. Па першым пытанні адказы фіксуе першая

экспертная група, па другім пытанні – другая і г.д.Затым удзельнікі мяняюцца месцамі. Самы актыўны ўдзельнік можа саступіць месца іншаму.

Метад “Інтэрв’ю”

Прапаноўваецца тэма заняткаў. Затым вучні працуюць у парах, дзе адзін задае пытанні, а другі адказвае на іх. Пара працуе не больш за 5 хвілін. Інфармацыю можна запісваць, так як гэта робяць журналісты. А затым кожная пара прадстаўляе атрыманую ў ходзе інтэрв’ю інфармацыю. Тут выпрацоўваецца ўменне слухаць, чуць сказанае, уменне весці дыялог.

Метад “Майстэрня будучага”

Настаўнік прапаноўвае пэўнае пытанне або праблему. На паперы запісваюцца ўсе плюсы і мінусы дадзенай праблемы. Затым вучні іх аргументуюць. Напрыклад, “Зносіны чалавека і мастацтва”, “Узаемадзеянне чалавека і грамадства”. Крытыкі ці настаўнік падводзіць вынік першага этапу

Другі этап – канструяванне ідэальнай мадэлі рашэння пэўнай праблемы і яе абарона. Кожная група прадстаўляе і абараняе сваю мадэль, можна выбраць самыя цікавыя ідэі.

Этап трэці – рэальныя дзеянні ў рашэнні прапанаванай праблемы, якія таксама прадстаўляе група і работа іх ацэньваецца.

Пры выкарыстанні прапанаваных метадаў важна правядзенне рэфлексіі. Можна скарыстаць рэфлексіўны круг, калі ўдзельнкі па крузе расказваюць пра свой эмацыянальны стан. Метад Астравы, прапанова выбраць свой востраў сярод астравоў Радасць, Смутак, Задавальненне, Бермудскі трохвугольнік, Чаканне і г.д. Метад “Завяршы фразу” (гульня дазволіла зразумець…, я задумаўся…). Міні-сачыненне “Як я ацэньваю вынік сённяшняй класнай гадзіны”, “Што дало мне сённяшняе мерапрыемства”.

Цікавы метад – ПАПС –формула

П – пазіцыя (я лічу…)

А – абаснаванне, тлумачэнне (таму што…)

П – прыклад (магу даказаць гэта на прыкладзе…)

С – следства (зыходзячы з гэтага, я раблю вывад…)

Інтэрактыўныя метады выхаваўчай работы дазваляюць рашаць наступныя задачы:

Актыўнае ўключэнне кожнага ў працэс якой-небудзь дзейнасці;

Павышэнне пазнавальнай матывацыі;

Навучанне навыкам паспяховых зносін;

Выпрацоўка ўмення працаваць у камандзе;

Развіццё навыкаў самастойнай дзейнасці;

Фарміраванне поглядаў, перакананняў у працэсе дзейнасці.

Выкарыстаная літаратура:

1. Буткевич, В.В. Патриотическое воспитание учащихся: история и современность: пособие для педагогов общеобразовательных учреждений / В.В. Буткевич. – Минск: Нац. ин-т образования, 2010. – 208 с.

2. Кашлев С.С.Технология интерактивного обучения / С.С.Кашлев.- Минск: ЧУИП “Белорусский верасень”, 2005. – 195 с.

3. Сташкевич, О.Л. Гражданско-патриотическое воспитание личности: ценностный аспект / О.Л.Сташкевич // Адукацыя і выхаванне. – №10 – 2008. С. 8-12.

4. Шкуцько, Г. "Я - грамадзянін Рэспублікі Беларусь": шляхі да грамадзянскасці і патрыятызму / Г. Шкуцько // Гісторыя: праблемы выкладання. – Серыя "У дапамогу педагогу". – 2008. – № 9. – С. 15-28.